КАНТРОЛЬНЫ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа вышэйшай адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка"

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
А.В. Макоўчык
"21" [illegible] 2019 г.

Рэгістрацыйны УД 31-1-20 /вуч.

# Палеаграфія

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па дысцыпліне па выбары для спецыяльнасці:**

1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура

2019 г.

2

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта ОСВО 1-02 03 03, уведзенага ў дзеянне пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30.08.2013 г. № 87 і вучэбнага плана для спецыяльнасці 1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Н.У. Чайка, прафесар кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы вышэйшай адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", доктар філалагічных навук, прафесар

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

А.С. Васілеўская, загадчык кафедры беларускага і рускага мовазнаўства, БДПУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

Г.К. Чахоўскі, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства БДУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы вышэйшай адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 9 ад 19.04.2019 г.)

Загадчык кафедры
мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ____________ Д.В. Дзятко

Саветам філалагічнага факультэта ўстановы вышэйшай адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 8 ад 24.04.2019 г.)

Старшыня савета ____________ В.Д. Старычонак

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Метадыст вучэбна-метадычнага
аддзела БДПУ ____________ С.А.Старадуб

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

**Мэта вучэбнай дысцыпліны па выбары “Палеаграфія”** – садзейнічаць фарміраванню гісторыка-філалагічнай эрудыцыі будучых спецыялістаў; навучыць аналізаваць і абагульняць наяўныя моўныя факты; сфарміраваць навыкі практычнага ўкаранення атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці; выхаваць павагу да духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны славянскіх народаў.

**Задачы вучэбнай дысцыпліны па выбары “Палеаграфія”:**

– даць уяўленне аб палеаграфіі як дапаможнай гісторыка-філалагічнай дысцыпліне;

– пазнаёміць з палеаграфічнымі асаблівасцямі кірылічных помнікаў X – XIX стст.;

– пашырыць і засвоіць веды і навыкі, якія дапамогуць правільна чытаць старажытныя помнікі;

– навучыць арыентавацца ў спецыяльнай літаратуры і самастойна знаходзіць адказы на складаныя тэарэтычня і практычныя пытанні.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны па выбары “Палеаграфія” павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў *акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый.*

***Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый***

Студэнт павінен:

АК-5. Быць здольным ствараць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

***Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый спецыяліста***

Студэнт павінен:

СЛК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

СЛК-4. Валодаць навыкамі здароўезберагання.

***Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый***

Студэнт павінен быць здольным:

ПК-1. Кіраваць вучэбна-пазнавальнай і вучэбна-даследчай дзейнасцю навучэнцаў.

ПК-2. Выкарыстоўваць аптымальныя метады, формы і сродкі навучання.

ПК-3. Арганізоўваць і праводзіць вучэбныя заняткі розных відаў і форм.

ПК-4. Арганізоўваць самастойную працу навучэнцаў.

ПК-11. Развіваць вучэбныя магчымасці і здольнасці навучэнцаў на аснове сістэмнай педагагічнай дыягностыкі.

ПК-12. Развіваць навыкі самастойнай работы навучэнцаў з вучэбнай, даведачнай, навуковай літаратурай і інш. крыніцамі інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ПК-13. Арганізоўваць і праводзіць карэкцыйна-педагагічную дзейнасць з навучэнцамі.

ПК-14. Папярэджваць і пераадольваць непаспяховасць навучэнцаў.

ПК-15. Фармуляваць адукацыйныя і выхаваўчыя мэты.

ПК-16 – ацэньваць вучэбныя дасягненні навучэнцаў, а таксама ўзроўні іх выхаванасці і развіцця.

ПК-17. Ажыццяўляць прафесійную самаадукацыю і самавыхаванне з мэтай удасканалення прафесійнай дзейнасці.

ПК-18. Арганізоўваць цэласны адукацыйны працэс з улікам сучасных адукацыйных тэхналогій і педагагічных інавацый.

ПК-19. Аналізаваць і ацэньваць педагагічныя з’явы і падзеі мінулага ў святле сучасных навуковых ведаў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны па выбары “Палеаграфія” студэнт павінен ***ведаць:***

– асноўныя прыёмы палеаграфічнага аналізу;

– знешнія асаблівасці найбольш вядомых пісьмовых помнікаў;

– этапы і заканамернасці развіцця тэхнікі кірылічнага пісьма.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны па выбары “Палеаграфія” студэнт павінен ***умець:***

– адрозніваць па знешнім выглядзе найбольш важныя помнікі Старажытнай Русі і Вялікага Княства Літоўскага;

– чытаць асобныя тэксты XI – XVIII ст., змешчаныя ў вучэбных дапаможніках, а таксама па фотакопіях;

– расшыфроўваць цітлы і лічбы;

– праводзіць лінгвістычныя і культуралагічныя назіранні, рабіць абагульненні і вывады.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны па выбары “Палеаграфія” студэнт павінен ***валодаць:***

– уменнем аналізаваць старажытныя тэксты;

– навыкамі класіфікацыі старажытных тыпаў пісьма;

– прыёмамі палеаграфічнага аналізу.

*Месца вучэбнай дысціпліны ў шэрагу іншых дысцыплін.*“Палеграфія”– вучэбная дысцыпліна, якая мае ярка выражаны міждысцыплінарны характар, што абумоўлена яе аб’ектам даследавання. Паколькі старажытныя віды пісьма вывучаюцца ў розных навуках – мовазнаўстве, літаратуразнаўстве, гісторыі і інш., то гэта дазваляе настаўніку ў працэсе выкладання беларускай мовы і літаратуры на анамастычным матэрыяле паспяхова ажыццяўляць міжпрадметныя сувязі.

*Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі дысцыплінамі.* Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны прадугледжваецца пераемнасць і сувязь яго з іншымі лінгвістычнымі дысцыплінамі (сучаснай беларускай літаратурнай мовай, актуальнымі праблемамі беларускай мовы, гісторыяй беларускай літаратурнай мовы, параўнальнай граматыкай усходнеславянскіх моў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гістарычнай граматыкай, стараславянскай мовай і інш.), а таксама са школьным курсам беларускай мовы. Асаблівая ўвага пры выкладанні асобных тэм павінна ўдзяляцца вывучэнню спецыфічных рыс беларускіх уласных імёнаў. Лекцыйныя і практычныя заняткі, прадугледжаныя вучэбным планам, узаемна звязаны і арганічна дапаўняюць адно аднаго, даючы магчымасць паглыбіць і ўдасканаліць набытыя веды.

У адпаведнасці з вучэбным планам установы вышэйшай адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка" на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Палеаграфія" на 4 курсе адводзіцца: усяго – 100 гадзін, аўдыторных – 40 гадзін, на самастойную працу – 24 гадзіны.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая.

*Размеркаванне гадзін па семестрах на дзённым аддзяленні:*

8 семестр:

Лекцыі – 22 гадзіны.

Практычныя заняткі – 18гадзін.

На самастойную працу – 24 гадзіны.

На самастойную працу адведзена па раздзелах (тэмах) наступная колькасць гадзін: раздзел 1.1 – 2 гадзіны, 2.2 – 2 гадзіны, 2.3 – 2 гадзіны, 3.2 – 2 гадзіны, 4.1 – 2 гадзіны, 4.3 – 2 гадзіны, 4.4 – 2 гадзіны 5.1 – 2 гадзіны, 5.3 – 2 гадзіны, 6.2 – 2 гадзіны, 7.2 – 2 гадзіны, 7.3 – 2 гадзіны.

Раздзелы (тэмы), па якіх праводзяцца рэйтынгавыя кантрольныя работы: раздзел 4.1 – 4.2 – рэйтынгавая кантрольная работа № 1, раздзел 5.1 – 5.2 рэйтынгавая кантрольная работа № 2, раздзел 6.1 – 6.2 – рэйтынгавая кантрольная работа № 3.

Форма атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне – **экзамен**.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**1. Уводзіны.** Палеаграфія як дапаможная гісторыка-філалагічная дысцыпліна. Сувязь палеаграфіі з іншымі гістарычнымі і лінгвістычнымі дысцыплінамі.

**2. Станаўленне і сутнасць палеаграфічнай метадалогіі.**

2.1. Метад палеаграфічнага аналізу і яго асноўныя прыёмы. Датаванне, лакалізацыя і вызначэнне аўтарства помнікаў.

2.2. Першыя спробы палеаграфічнага аналізу і іх прычыны. “Паморскія адказы” А. Дзянісава. Роля І.І. Сразнеўскага, А.І. Сабалеўскага, Я.Ф. Карскага і інш. у распрацоўцы славяна-кірылічнай палеаграфіі.

2.3. Палеаграфічныя даследаванні 20 і 21 ст. Рукапісы-фальсіфікацыі. Роля палеографаў і лінгвістаў у выкрыцці падробак.

**3. Пачатак славянскага пісьменства.**

3.1. Пытанне пра функцыянаванне пісьменства ў славян да прыняцця хрысціянства. Рунічнае пісьмо. Час, месца і ўмовы ўзнікнення славянскага пісьменства.

3.2. Кірыліца і глаголіца: пытанне аб паходжанні азбук. Палімсесты. Дзейнасць Кірыла і Мяфодзія. Кірыліца і глаголіца на ўсходнеславянскіх землях.

**4. Кірылічнае пісьменства Старажытнай Русі.**

4.1. Асноўныя тыпы помнікаў пісьменства 10 – 13 стст. Надпісы на прадметах быту, камянях, графіці на сценах Кіеўскай Сафіі. Найбольш старажытныя датаваныя помнікі на пергаменце. Пісьмо на драўляных дошках. Берасцяныя граматы.

4.2. Помнікі 10 – 13 стст., створаныя на тэрыторыі Беларусі.

4.3. Ранні і позні устаў. Матэрыялы і прылады для пісьма. Фарбавальныя рэчывы. Фармат і кошт рукапісаў. Мастацкае аздабленне помнікаў: арнамент, мініяцюра, пераплёт. Візантыйскі арнамент.

4.4. Палеаграфічныя асаблівасці помнікаў 10 – 13 ст.

4.5. Фармат рукапісаў 10 – 13 стст. Папяровыя млыны на Беларусі.

**5. Кірылічнае пісьменства 14 – 17 стст.**

5.1. Пісьменства ў Вялікім Княстве Літоўскім і землях сучаснай Расіі. Гістарычныя падзеі і іх ўплыў на развіццё пісьменства. Пашырэнне цэнтраў кнігапісання. Вялікакняская канцылярыя і яе функцыі. Асноўныя помнікі беларускай і рускай рукапіснай кнігі 14 – 16 стст. Узнікненне скарапісу ў беларускім дзелавым пісьменстве. Віды скарапісу. Асаблівасці беларускага скарапісу.

5.2. Палеаграфічныя асаблівасці рукапісных помнікаў 14 – 17 ст. Паўустаў, абрысы паўустаўных літар. Старэйшы паўустаў. Малодшы паўустаў. Надрадковыя знакі. Скарачэнні. Вязь. Літоўская і маскоўская вязь. Тайнапіс.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5.3. Мастацкае аздабленне рукапісаў. Тэраталагічны, балканскі і неавізантыйскі стылі арнаменту. Матэрыялы і прылады пісьма. Выкарыстанне пергаменту. З'яўленне паперы. Тэхналогія вырабу паперы. Філігрань. Вадзяныя знакі. Упарадкаванне фармату кніг.

**6. Кірылічнае пісьменства 18 – 19 стст.**

6.1. Кірылічнае пісьменства 18 – 19 стст. Развіццё графічнай сістэмы.

6.2. Грамадзянскі шрыфт і яго ўплыў на пісьменства ўсходніх славян. Звужэнне жанраў рукапісных дакументаў у 19 ст.

6.3. Палеаграфічныя асаблівасці пісьмовых помнікаў 18 – 19 ст. Мастацкае аздабленне: пераплёты, вокладкі. Фабрычная папера.

**7. Лацінскае і арабскае пісьмо на тэрыторыі Беларусі.**

7.1. Вытокі лацінскага пісьма. З'яўленне і выкарыстанне лацінкі ў Вялікім Княстве Літоўскім.

7.2. Месца і роля лацінскай графікі ў практыцы беларускага кнігадрукавання 19 – 20 ст.

7.3. Арабскае пісьмо на беларускіх землях, прычыны яго ўзнікнення. Кітабы, іх палеаграфічныя і моўныя асаблівасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
## (дзённая форма атрымання адукацыі)

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Самастойная работа | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыйныя | практычныя | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | | 6 | 7 |
| | **ПАЛЕАГРАФІЯ (40 гадзін)** | **22** | **18** | **24** | | |
| **1.** | **Уводзіны (2 г.)** | **2** | | | | |
| 1.1. | 1. Палеаграфія як дапаможная гісторыка-філалагічная дысцыпліна.<br>2. Сувязь палеаграфіі з іншымі гістарычнымі і лінгвістычнымі дысцыплінамі. | 2 | | 2 | 1, 2, 7 | апытванне, вуснае паведамленне |
| **2.** | **Станаўленне і сутнасць палеаграфічнай метадалогіі (6 г.)** | **4** | **2** | | | |
| 2.1. | 1.Метад палеаграфічнага аналізу і яго асноўныя прыёмы.<br>2. Датаванне, лакалізацыя і вызначэнне аўтарства помнікаў. | 2 | | | 2, 6, 8 | |
| 2.2. | 1. Першыя спробы палеаграфічнага аналізу і іх прычыны.<br>2. "Паморскія адказы" А. Дзянісава. Роля І.І. Сразнеўскага, А.І. Сабалеўскага, Я.Ф. Карскага і інш. у распрацоўцы славяна-кірылічнай палеаграфіі | 2 | | 2 | 1, 9, 10 | |
| 2.3. | 1. Палеаграфічныя даследаванні 20 і 21 ст. Рукапісы-фальсіфікацыі.<br>2. Роля палеаграфаў і лінгвістаў у выкрыцці падробак | | 2 | 2 | 2 | апытванне, вуснае паведамленне |
| **3.** | **Пачатак славянскага пісьменства (4 г.)** | **2** | **2** | | | |
| 3.1. | 1.Пытанне пра функцыянаванне пісьменства ў славян да прыняцця хрысціянства.<br>2. Рунічнае пісьмо. Час, месца і ўмовы ўзнікнення славянскага пісьменства. | 2 | | | 1 | |
| 3.2. | 1. Кірыліца і глаголіца: пытанне аб паходжанні азбук. Палімсесты.<br>2. Дзейнасць Кірыла і Мяфодзія.<br>3. Кірыліца і глаголіца на ўсходнеславянскіх землях. | | 2 | 2 | | Камбінаванае апытванне, вуснае паведамленн |
| **4.** | **Кірылічнае пісьменства Старажытнай Русі (10 г.)** | **4** | **6** | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 4.1. | 1. Асноўныя тыпы помнікаў пісьменства 10-13 стст.<br>2. Надпісы на прадметах быту, камянях, графіці на сценах Кіеўскай Сафіі.<br>3. Найбольш старажытныя датаваныя помнікі на пергаменце.<br>4. Пісьмо на драўляных дошках. Берасцяныя граматы. | 2 | | 2 | 1, 3, 6 | |
| 4.2. | 1. Помнікі 10 – 13 стст., створаныя на тэрыторыі Беларусі. | | 2 | | | апытванне, вуснае паведамленне |
| 4.3. | 1. Ранні і позні устаў.<br>2. Матэрыялы і прылады для пісьма. Фарбавальныя рэчывы.<br>3. Фармат і кошт рукапісаў.<br>4. Мастацкае аздабленне помнікаў: арнамент, мініяцюра, пераплёт. Візантыйскі арнамент. | 2 | | 2 | 1, 2, 6, 7 | апытванне, вуснае паведамленне |
| 4.4. | 1. Палеаграфічныя асаблівасці помнікаў 10 – 13 стст. | | 2 | 2 | | апытванне, вуснае паведамленне, пісьмовае заданне |
| 4.5. | 1. Фармат рукапісаў 10 – 13 стст. Папяровыя млыны на Беларусі. | | 2 | | | апытванне, вуснае паведамленне |
| **5.** | **Кірылічнае пісьменства 14 – 17 стст. (6 г.)** | **4** | **2** | | | |
| 5.1. | 1. Пісьменства ў Вялікім Княстве Літоўскім і землях сучаснай Расіі. Гістарычныя падзеі і іх ўплыў на развіццё пісьменства. Пашырэнне цэнтраў кнігапісання.<br>2 Вялікакняская канцылярыя і яе функцыі.<br>3. Асноўныя помнікі беларускай і рускай рукапіснай кнігі 14 – 16 стст.<br>4. Узнікненне скорапісу ў беларускім дзелавым пісьменстве. Віды скорапісу.<br>5. Асаблівасці беларускага скорапісу. | 2 | | 2 | 1, 2, 5 | Франтальнае апытванне, вуснае паведамленне |
| 5.2. | 1. Палеаграфічныя асаблівасці рукапісных помнікаў 14 – 17 стст.<br>2. Паўустаў, абрысы паўустаўных літар. Старэйшы паўустаў. Малодшы паўустаў.<br>3. Надрадковыя знакі. Скарачэнні. Вязь. Тайнапіс. | 2 | | | 1, 2, 6, 9 | апытванне, вуснае паведамленне |
| 5.3. | 1. Мастацкае аздабленне рукапісаў.<br>2. Візантыйскі, тэраталагічны, балканскі і неавізантыйскі стылі арнаменту.<br>3. З'яўленне паперы. Філігрань. Вадзяныя знакі. Упарадкаванне фармату кніг. | | 2 | 2 | 1 | апытванне, вуснае паведамленне |
| **6.** | **Кірылічная палеаграфія 18 – 19 стст. (6 г.)** | **4** | **2** | | | |
| 6.1. | 1. Кірылічнае пісьменства 18 – 19 стст. | 2 | | | 10 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Развіццё графічнай сістэмы. | | | | | |
| 6.2. | 1. Грамадзянскі шрыфт і яго ўплыў на пісьменства ўсходніх славян.<br>2. Звужэнне жанраў рукапісных дакументаў у 19 ст. | | 2 | 2 | | апытванне, вуснае паведамленне |
| 6.3. | 1. Палеаграфічныя асаблівасці пісьмовых помнікаў 18 – 19 ст.<br>2. Мастацкае аздабленне: пераплёты, вокладкі. Фабрычная папера. | 2 | | | 7 | апытванне, вуснае паведамленне |
| **7.** | **Лацінскае і арабскае пісьмо на тэрыторыі Беларусі (6 г.)** | **2** | **4** | | | |
| 7.1. | 1. Вытокі лацінскага пісьма.<br>2. З'яўленне і выкарыстанне лацінкі ў Вялікім Княстве Літоўскім. | 2 | | | 2, 6, 7 | апытванне, вуснае паведамленне |
| 7.2. | 1. Месца і роля лацінскай графікі ў практыцы беларускага кнігадрукавання 19 – 20 ст. | | 2 | 2 | 1 | апытванне, вуснае паведамленне |
| 7.3. | 1. Арабскае пісьмо на беларускіх землях, прычыны яго ўзнікнення.<br>2. Кітабы, іх палеаграфічныя і моўныя асаблівасці. | | 2 | 2 | | апытванне, вуснае паведамленне |
| | **Усяго:** | **22** | **18** | **24** | | **экзамен** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА


**Асноўная літаратура**

1. Калечыц, І. Л. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны : вучэб.-метад. дапам. / І. Л. Калечыц ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. пед. ун-т. – 2-е выд. – Мінск : БДПУ, 2009. – 140 с.
2. Калечиц, И. Л. Практикум по вспомогательным историческим дисциплинам: палеография, геральдика, хронология, ономастика : пособие для студентов вузов / И. Л. Калечиц ; М-во образования Респ. Беларусь, Белорус. гос. пед. ун-т. – 2-е изд., испр. и доп. – Минск : БГПУ, 2015. – 156 с.

**Дадатковая літаратура**

1. Груша, А. І. Беларуская кірылічная палеаграфія : вучэб. дапам. / А. І. Груша. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2006. – 87 с.
2. Истрин, В. А. 1100 лет славянской азбуки / В. А. Истрин. – М. : Наука, 1988. – 192 с.
3. Карский, Е. Ф. Славянская кирилловская палеография / Е. Ф. Карский ; предисл. В. И. Борковского. – М. : Наука, 1979. – 494 с.
4. Кобрин, В. Б. Вспомогательные исторические дисциплины / В. Б. Кобрин, Р. А. Леонтьева, П. А. Шорин. – М. : Просвещение, 1984. – 106 с.
5. Козлов, В. П. Тайны фальсификации. Анализ подделок исторических источников XVIII–XIX веков / В. П. Козлов. – М. : Аспект Прес, 1996. – 272 с.
6. Леонтьева, Г. А. Ключи к тайнам КЛИО: палеография, метрология, хронология, геральдика, нумизматика, ономастика, генеалогия : кн. для учащихся и студентов / Г. А. Леонтьева, П. А. Шорин, В. Б. Кобрин. – М. : Просвещение, 1994. – 286 с.
7. Леонтьева, Г. А. Вспомогательные исторические дисциплины : учеб. для студентов высш. учеб. заведений / Г. А. Леонтьева, П. А. Шорин, В. Б. Кобрин ; под ред. Г. А. Леонтьевой. – М. : ВЛАДОС, 2003. – 368 с.
8. Куль-Сяльверстава, С. Я. Беларуская палеаграфія : навуч. дапам. / С. Я. Куль-Сяльверстава. – Гродна : Гродзен. дзярж. ун-т, 1996. – 104 с.
9. Тихомиров, М. Н. Русская палеография / М. Н. Тихомиров, А. В. Муравьев. – М. : Высш. шк., 1966. – 288 с.
10. Ячмянёва, І. М. Беларуская палеаграфія : дапаможнік / І. М. Ячмянёва. – Магілеў : Магілеўс. дзярж. ун-т, 2007. – 80 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ ПА ВЫБАРЫ “ПАЛЕАГРАФІЯ”

Для павышэння якасці прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў мэтазгодна на працягу ўсяго тэрміну навучання ў ВНУ прыцягваць кожнага студэнта да сістэматычнай самастойнай работы. Змест і формы самастойнай работы студэнтаў распрацоўваюцца супрацоўнікамі кафедры ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі адукацыйнага стандарту.

Матэрыял, рэкамендаваны для самастойнага вывучэння, студэнты павінны атрымліваць ад выкладчыка з першых тыдняў семестра. Матэрыял для самастойнай працы, распрацаваны выкладчыкамі кафедры, можа ўключаць комплексы індывідуальных заданняў па пэўных тэмах, сістэму індывідуальных дамашніх кантрольных работ па тэмах і раздзелах дысцыпліны.

На самастойнае вывучэнне варта прапаноўваць асобныя тэмы лекцый або іх часткі па раней складзеным плане з указаннем асноўнай і дадатковай літаратуры па праблеме.

Эфектыўнасць самастойнай працы студэнтаў залежыць ад многіх фактараў. Тут і аптымальна выбраная форма працы, і дакладныя, канкрэтныя ўказанні і рэкамендацыі выкладчыка з наступнай аб’ектыўнай ацэнкай яе вынікаў і, самае важнае, сістэматычнасць і паслядоўнасць у правядзенні такой працы.

Самастойная работа студэнтаў прадугледжвае выкананне кантрольных прац, тэстаў, падрыхтоўку вусных паведамленняў і пісьмовых рэфератаў па вызначанай тэматыцы, знаёмства з навуковай, навукова-папулярнай, хрэстаматыйнай літаратурай, з тэрміналагічнымі слоўнікамі, пераклад, рэферыраванне і анатаванне прафесійна арыентаваных тэкстаў і інш.

Самастойная работа студэнтаў праводзіцца ў аб’ёме, прадугледжаным вучэбным планам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| п/п | Назва тэмы, раздзела | Коль-касць гадзін на СПС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1.1 | Палеаграфія як дапаможная гісторыка-філалагічная дысцыпліна. | 2 | Падрыхтаваць канспект пра мэты і задачы курса, пра асноўныя перыяды развіцця палеаграфіі. | Канспект |
| 2.2 | Першыя спробы палеаграфічнага аналізу і іх прычыны. “Паморскія адказы” А. Дзянісава. Роля | 2 | Падрыхтаваць партфоліа, дзе будуць праілюстраваны асноўныя працы І.І. Сразнеўскага, Я.Ф. | Прэзентацыя |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | І.І. Сразнеўскага, А.І. Сабалеўскага, Я.Ф. Карскага і інш. у распрацоўцы славяна-кірылічнай палеаграфіі. | | Карскага па распрацоўцы тэарэтычных пытанняў славяна-кірылічнай палеаграфіі. | |
| 2.3 | Палеаграфічныя даследаванні 20 і 21 ст. Рукапісы-фальсіфікацыі. Роля палеаграфаў і лінгвістаў у выкрыцці падробак. | 2 | Падрыхтаваць прэзентацыю пра Палеаграфічныя даследаванні 20 і 21 ст | Прэзентацыя |
| 3.2 | Дзейнасць Кірыла і Мяфодзія. Кірыліца і глаголіца на ўсходнеславянскіх землях. | 2 | Сабраць і скапіраваць фрагменты кірылічных і глагалічных помнікаў пісьменнасці, зрабіць іх аналіз. | Картатэка моўных фактаў; рэферат |
| 4.1 | Надпісы на прадметах быту, камянях, графіці на сценах Кіеўскай Сафіі. Найбольш старажытныя датаваныя помнікі на пергаменце. Пісьмо на драўляных дошках. Берасцяныя граматы. | 2 | Правесці аналіз надпісаў на прадметах быту, камянях, графіцы на сценах Кіеўскай Сафіі. | Даклад |
| 4.3 | Мастацкае аздабленне помнікаў: арнамент, мініяцюра, пераплёт. Візантыйскі арнамент. | 2 | Знайсці і зрабіць копіі фрагментаў мастацкага аздабленне помнікаў: арнамент, мініяцюра, пераплёт. Візантыйскі арнамент. Раскласіфікаваць іх па тыпах. | Картатэка моўных фактаў; рэферат. |
| 4.4 | Палеаграфічныя асаблівасці помнікаў 10 – 13 стст. | 2 | Падрыхтаваць рэферат пра палеаграфічныя асаблівасці помнікаў 10 – 13 стст. | Рэферат |
| 5.1 | Узнікненне скорапісу ў беларускім дзелавым пісьменстве. Віды скорапісу. Асаблівасці беларускага скорапісу. | 2 | Падрыхтаваць прэзентацыю на тэму “Асаблівасці беларускага скорапісу”. | Прэзентацыя |
| 5.3 | Філігрань. Вадзяныя знакі. Упарадкаванне фармату кніг. | 2 | Падрыхтаваць рэферат пра філігрань, вадзяныя знакі, упарадкаванне фармату кніг. | Рэферат |
| 6.2 | Звужэнне жанраў рукапісных дакументаў у 19 ст. | 2 | Правесці аналіз асноўных жанраў рукапісных дакументаў у 19 | Даклад |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | ст. | |
| 7.2 | Лацінская графіка ў практыцы беларускага кнігадрукавання 19 – 20 ст. | 2 | Падрыхтаваць прэзентацыю на тэму "Лацінская графіка ў практыцы беларускага кнігадрукавання". | Прэзентацыя |
| 7.3 | Кітабы, іх палеаграфічныя і моўныя асаблівасці. | 2 | Прааналізаваць арабскія помнікі пісьменства. Выявіць іх моўныя асаблівасці. | Рэферат |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Кантрольная работа № 1. Кірылічнае пісьменства Старажытнай Русі.**

Прааналізаваць помнікаў пісьменства 10 – 13 стст. Вызначыць палеаграфічныя асаблівасці ранняга ўстава. Выявіць матэрыялы і прылады для пісьма, фарбавальныя рэчывы, фармат і кошт рукапісаў, мастацкае аздабленне помнікаў: арнамент, мініяцюра, пераплёт.

**Кантрольная работа № 2. Кірылічнае пісьменства 14 – 17 стст.**

Прааналізаваць тэксты. Вызначыць палеаграфічныя асаблівасці паўустаўных дакументаў 14 – 17 ст.: памер літар, нахіл, вынасныя элементы і надрадковыя знакі. Апісаць абрысы паўустаўных літар, надрадковыя знакі, скарачэнні, вязь.

**Кантрольная работа № 3. Кірылічнае пісьменства 18 – 19 стст.**

Зрабіць палеаграфічны аналіз устаўных дакументаў. Вызначыць кірылічныя асаблівасці ўстаўных дакументаў. : памер літар, нахіл, вынасныя элементы і надрадковыя знакі. Апісаць абрысы скарапісных літар, надрадковыя знакі, скарачэнні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# АПІСАННЕ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для атрымання аб’ектыўнай інфармацыі аб ўзроўні паспяховасці студэнтаў мэтазгодна сістэматычна выкарыстоўваць розныя віды кантролю, сярод якіх: апераджальны, бягучы, тэматычны, прамежкавы і выніковы. Кожны з відаў кантролю ўжываецца на пэўным этапе навучання і выконвае ў педагагічным працэсе адну з функцый: стымулюючую, навучальную, дыягнастычную, выхаваўчую і інш.

Апераджальная, бягучая і прамежкавая дыягностыка кампетэнцый па вучэбнай дысцыпліне “Палеаграфія” можа мець розныя формы, сярод якіх:

вусны кантроль: франтальнае, індывідуальнае, ушчыльненае (камбінаванае) апытванне на лекцыях і практычных занятках, калёквіумы, даклады на семінарах, вусныя залікі;

пісьмовы кантроль: палеаграфічны аналіз фрагментаў тэкстаў, кантрольныя апытанні, кантрольныя работы, пісьмовыя работы па аўдыторных (дамашніх) практыкаваннях, рэфераты, пісьмовыя залікі;

графічны кантроль: аналіз графічных сродкаў тэкстаў розных эпох; тэставы кантроль: падбор кароткіх адказаў у адпаведнасці з заданнямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# КРЫТЭРЫІ І ПАКАЗЧЫКІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ НА ЭКЗАМЕНЕ

| Адзнака | Крытэрыі |
|---|---|
| **10** | Студэнт свабодна валодае вучэбным матэрыялам і паказвае яго поўнае разуменне; выяўляе самы высокі ўзровень усвядомленасці вывучанага, абгрунтавана выкладае свае думкі, выкарыстоўваючы звесткі з дадатковай літаратуры, робіць самастойныя вывады і заключэнні, падмацоўвае свой адказ уласнымі ілюстрацыямі-доказамі. Аналіз моўных фактаў выкананы без памылак, што сведчыць пра ўменне прымяняць тэарэтычныя веды для вырашэння практычных задач навучання. Перадае матэрыял паслядоўна, захоўваючы нормы літаратуранай  мовы; праяўляе адказнасць, пазнавальную актыўнасць і крэатыўнасць. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **9** | Студэнт свабодна валодае вучэбным матэрыялам, дае поўнае азначэнне лінгвістычным паняццям, выяўляе высокі ўзровень усвядомленасці вывучанага і ўменне аргументавана выкладаць яго, падмацоўвае свой адказ яркімі ілюстрацыямі-доказамі (як з дапаможнікаў, так і самастойна падабранымі). Аналіз моўных фактаў выкананы без памылак, што сведчыць пра ўменне прымяняць тэарэтычныя веды для вырашэння практычных задач навучання. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **8** | Студэнт у дастаткова поўным аб'ёме валодае вучэбным матэрыялам, самастойна абгрунтоўвае свой адказ і прыводзіць ілюстрацыі-доказы, узятыя з дапаможнікаў ці лекцый. Пры выкананні аналізу моўных фактаў дапускае асобныя недакладнасці, якія сам жа выпраўляе. Матэрыял выкладае паслядоўна, з захаваннем літаратурных нормаў; не дапускае  фактычных памылак. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **7** | Студэнт у дастаткова поўным аб'ёме перадае вучэбны матэрыял з асобнымі недакладнасцямі, якія выпраўляе пасля дадатковых пытанняў; можа абгрунтаваць свой адказ, прывесці ілюстрацыі-доказы; матэрыял выкладае паслядоўна з нязначнымі адхіленнямі ад літаратурнай нормы. Аналіз моўных фактаў выкананы з некаторымі памылкамі, якія выпраўляюцца самастойна. Маўленне ў асноўным адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **6** | Студэнт перадае вучэбны матэрыял з нязначнымі памылкамі, але выпраўляе іх з дапамогай выкладчыка; тэарэтычныя звесткі падмацоўвае ілюстрацыямі, але без дастаткова глыбокага і доказнага іх абгрунтавання; дапускае недакладнасці ў паслядоўнасці выкладу матэрыялу і яго моўным афармленні. Аналіз моўных фактаў выкананы з нязначнымі памылкамі, якія выпраўляюцца самастойна. Маўленне ў асноўным адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **5** | Студэнт ў асноўным ведае і разумее галоўныя палажэнні тэмы, але дапускае памылкі ў азначэнні паняццяў і фармулёўцы правіл, якія можа выправіць з дапамогай выкладчыка; выкладае матэрыял непаслядоўна; дапускае памылкі ў моўным афармленні. Аналіз моўных фактаў выкананы з памылкамі, якія |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | |
|---|---|
| | выпраўляюцца з дапамогай выкладчыка. Маўленне недастаткова лагічнае і выразнае. |
| **4** | Студэнт няпоўна выкладае праграмны вучэбны матэрыял, дапускае асобныя памылкі ў азначэнні паняццяў і фармулёўцы правіл, не ўмее абгрунтаваць свае развяжанні, адчувае цяжкасці пры падборы ілюстрацый; парушае паслядоўнасць выкладу матэрыялу, дапускае памылкі ў моўным афармленні адказу. Моўны аналіз выкананы з памылкамі, якія выпраўляюцца з дапамогай выкладчыка. Маўленне недастаткова лагічнае і выразнае. |
| **3** | Студэнт ўзнаўляе нязначную частку вучэбнага матэрыялу, дапускае істотныя памылкі, якія выпраўляе з дапамогай выкладчыка. Аналіз моўных фактаў не выкананы або выкананы з грубымі памылкамі. Маўленне не адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **2** | Студэнт называе асобныя моўныя факты з вучэбнага матэрыялу, дапускае істотныя памылкі, якія выпраўляе з дапамогай выкладчыка. Аналіз моўных фактаў не выкананы або выкананы са значнымі памылкамі. Маўленне не адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **1** | Студэнт не валодае нават асобнымі фактамі з вучэбнага матэрыялу, не ўсведамляючы іх месца ў агульнай моўнай сістэме. Аналіз моўных фактаў не выкананы або выкананы са значнымі памылкамі. Маўленне не адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

| **Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне** | **Назва кафедры** | **Прапановы аб зменах у змесце рабочай праграмы** | **Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала рабочую праграму (з указаннем даты і нумара пратакола)** |
|---|---|---|---|
| Старaславянская мова<br><br>Гісторыя рускай мовы<br><br>Агульнае мовазнаўства<br><br>Гісторыя беларускай мовы | мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | Дапоўніць спіс літаратуры новымі выданнямі | Рэкамендаваць праграму па вучэбнай дысцыпліне “Палеаграфія” да зацвярджэння (пратакол № 9 ад 19.04.2014 г.) |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ПЕРАЛІК ТЭАРЭТЫЧНЫХ ПЫТАННЯЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ "ПАЛЕАГРАФІЯ"

1. Палеаграфія як дапаможная гісторыка-філалагічная дысцыпліна.
2. Станаўленне і сутнасць палеаграфічнай метадалогіі. Першыя спробы палеаграфічнага аналізу і іх прычыны. Палеаграфічныя даследаванні XX і XXI ст. Рукапісы-фальсіфікацыі. Роля палеаграфаў і лінгвістаў у вызначэнні статусу летапісаў.
3. Метад палеаграфічнага аналізу і яго асноўныя прыёмы.
4. Роля І.І. Сразнеўскага, А.І. Сабалеўскага, Я.Ф. Карскага і інш. у распрацоўцы славяна-кірылічнай палеаграфіі.
5. Пачатак славянскага пісьменства. Функцыянаванне пісьменства ў славян да прыняцця хрысціянства.
6. Паўднёваславянская кірылічная і глагалічная палеаграфія.
7. Кірыліца і глаголіца на ўсходнеславянскіх землях. Функцыянаванне глаголіцы і кірыліцы ў пісьмовых помніках.
8. Кірылічнае пісьменства Старажытнай Русі. Асноўныя тыпы помнікаў пісьменства X-XIII стст. Палеаграфічныя асаблівасці помнікаў X-XIII ст. Ранні і позні устаў.
9. Матэрыялы і прылады для пісьма. Фарбавальныя рэчывы. Мастацкае аздабленне помнікаў. Візантыйскі арнамент.
10. Палеаграфічныя асаблівасці рукапісных помнікаў XIV-XVII стст.
11. Паўустаў. Паўустаўныя літары і знакі.
12. Старэйшы паўустаў. Позні паўустаў. Надрадковыя знакі. Скарачэнні. Вязь. Тайнапіс.
13.Вялікакняская канцылярыя і яе функцыі.
14. Асноўныя помнікі беларускай і рускай рукапіснай кнігі XIV-XVI стст.
15. Узнікненне скорапісу ў беларускім дзелавым пісьменстве. Віды скорапісу. Асаблівасці беларускага скорапісу.
16. Мастацкае аздабленне рукапісаў. Візантыйскі, тэраталагічны, балканскі і неавізантыйскія стылі арнаменту. З'яўленне паперы. Філігрань. Вадзяныя знакі. Упарадкаванне фармату кніг.
17. Кірылічнае пісьменства XVIII-XIX стст. Развіццё графічнай сістэмы.
18. Грамадзянскі шрыфт і яго ўплыў на пісьменства ўсходніх славян. Звужэнне жанраў рукапісных дакументаў у XIX ст.
19. Палеаграфічныя асаблівасці пісьмовых помнікаў XVIII-XIX ст. Мастацкае аздабленне: пераплёты, вокладкі. Фабрычная папера.
20. Лацінскае і арабскае пісьмо на тэрыторыі Беларусі. З'яўленне і выкарыстанне лацінкі ў Вялікім Княстве Літоўскім.
21.Арабскае пісьмо на беларускіх землях, прычыны ўзнікнення, функцыянаванне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ